# Наши юбиляры



## ВІКТАР ПЯТРОВІЧ КРАСНЕЙ



Споўнілася шэсцьдзесят гадоў Віктару Пятровічу Краснею – выдатнаму мовазнаўцу, слыннаму педагогу, прафесару кафедры гісторыі беларускай мовы, намесніку дэкана філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Нарадзіўся ён у вёсцы Халічы Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Пасля заканчэння сярэдняй школы служыў у радах Савецкай арміі. Звольніўшыся ў запас, паступіў на філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта, дзе праз пяць гадоў (1963) атрымаў дыплом філолага. Тры гады (1963–1966) працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры Рэвяціцкай сярэдняй школы Бярозаўскага раёна. З 1965 па 1968 г. займаўся ў аспірантуры БДУ на кафедры беларускай мовы, пасля заканчэння якой назаўсёды знітаваў свой лёс з філалагічным факультэтам. Толькі адзін год спатрэбіўся Віктару Пятровічу, каб раскрыцца як педагогу, быць заўважаным і пераведзеным з выкладчыка на пасаду старшага выкладчыка. З ліпеня 1971 па люты 1993 г. ён – дацэнт, а з сакавіка 1993 па цяперашні час – прафесар кафедры гісторыі беларускай мовы.

В.П.Красней распрацаваў і вядзе мовазнаўчыя курсы і спецкурсы па гісторыі беларускай літаратурнай мовы і па гістарычнай граматыцы. З'яўляецца сааўтарам вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў-філолагаў ВНУ Рэспублікі Беларусь, сярод якіх "Практыкум па гісторыі беларускай літаратурнай мовы" (два выданні – 1978, 1986); "Сучасная беларуская мова: Лексікалогія, фразеалогія" (1984); "Сучасная беларуская мова: Практычныя заняткі" (1989); "Сучасная беларуская мова: Уводзіны. Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Лексікаграфія. Фразеалогія. Фразеаграфія" (1995).

Асабліва плённай аказалася яго работа па стварэнню падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для сярэдняй школы: "Лексіка і фразеалогія беларускай мовы" (1982); "Грані слова" (два выданні – 1988, 1992); "Беларуская мова: Падручнік для 4–5 класаў школ з беларускай мовай навучання" (чатыры выданні – 1988, 1990, 1992, 1994); "Беларуская мова ў пятым класе: Метадычныя парады да падручніка" (1990); "Беларуская мова і падручнік для 6 класа для школ з беларускай мовай навучання" (1993). На ВДНГ СССР у 1987 г. яго вучэбнаму дапаможніку "Грані слова" прысуджаны бронзавы медаль. Усяго ж Віктар Пятровіч надрукаваў звыш 100 навукова-метадычных і навуковых прац, у тым ліку працы, прысвечаныя фарміраванню і развіццю беларускай нацыянальнай навуковай тэрміналогіі, стылістыцы беларускай мовы. У 1993 г. выйшаў з друку яго (у сааўтарстве) "Руска-беларускі слоўнік электратэхнічных тэрмінаў".

В.П.Красней – актыўны грамадскі работнік. З 1990 па 1994 г. – вучоны сакратар Рэспубліканскага Міжвузаўскага аб'яднання выкладчыкаў беларускай мовы; з 1994 г. па цяперашні час – член секцыі па беларускай мове і літаратуры навукова-метадычнага савета Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь; з 1989 г. па цяперашні час – член рэдакцыйнай рады навукова-метадычнага часопіса "Беларуская мова і літаратура ў школе" (з 1992 г. – "Роднае слова"). На працягу многіх гадоў з'яўляўся членам спецыялізаванага Савета па абароне дысертацый на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук пры Белдзяржуніверсітэце.

Віктар Пятровіч – чалавек выключна сціплы, надзейны, абавязковы і цягавіты. Свой юбілей ён сустракае ў клопаце пра лёс любімага роднага слова. Пажадаем яму моцнага здароўя, шчаслівага асабістага жыцця, вялікага плёну на ніве навукова-педагагічнай работы і грамадскай дзейнасці.

Калегі па працы